Травень 2023 Выпуск 1

# Імбрычак радасці



*Ілюстрацыя Арцёма, выкананая з дапамогай нейрасеткі.*

**У першым выпуску:**

Горад пельменяў

Вершы хоку

Калі дарослыя былі дзецьмі

Мая калекцыя манет

Нашы гадаванцы: Вавёрка, Шашка, Яша, Гірык, Цвічок, Морс, Жужа,Оскар, Сіма

Рэкі Беларусі

Мора Герадота

## Вітаем усіх добрых людзей!

Мы, беларускія дзяўчаткі і хлопцы, разляцеліся па розных куточках планеты Зямля. Але аб'ядноўвае нас усіх вясёлы нораў, няўтрымная цікаўнасць да жыцця і жаданне ствараць гэтую газетку.

Запрашаем вас сесці з намі пры агульным стале і выпіць незвычайную гарбатку з імбрычка радасці. Мы запарым для вас духмяны напой з фантастычных казак, цікавых артыкулаў ды інтэрв'ю, кранальных вершаў, захапляльных апавяданняў, смешных анекдотаў і смачных рэцэптаў.

У стварэнні першага нумару газеты прымалі ўдзел: Уладзь, Маруся, Фрося, Мікалай, Ліза, Міша, Міхась, Света, Люся, Арцём, Мікалай, Ваня, Міра, Соф'я.

## ГОРАД ПЕЛЬМЕНЯЎ

*Казку напісалі Арцём, Уладзь, Міхась, Ваня, Міша, Ліза, Ніка, Люба*

Ніхто ўжо дакладна не ўзгадае, адкуль узяўся той рондаль з вадой. Гіганцкі, металічны, самотны, ён стаяў пасярод пустэльні. Але факт: аднойчы рондаль пачаў разаграявацца. З кожнай хвілінай вада награвалася ўсё больш і больш, пакуль не здарыўся сапраўдны цуд: у рондалі нешта з’явілася! Гэтым “нешта” быў першы пельмень. Мяккі, безабаронны, тоўсценькі, не надта разумны, але ж надзвычай добры. Меў ён нораў вясёлы і лагодны. Можа, менавіта праз сваю незласлівасць атрымаў той першы, а потым кожны наступны пельмень, дар – 9 жыццяў.

Прайшло зусім мала часу, і ўжо ў рондалі весела булькалі шматлікія нованароджаныя пельмешкі. Кругленькія і энэргічныя, яны радаваліся кожнаму новаму дню.



А як мінуў яшчэ нейкі час, заснавалі пельмені цэлы горад. Усіх жыхароў яднала адна і тая ж рыса: кожны пельмень быў справядлівы. На жаль, дабрабыт суседа часта выклікае не захапленне, а зайздрасць. Людзі, што жылі недалёка, не маглі змірыцца з радасным, вольным і справядлівым ладам суседзяў.



Як той кіпень у рондалі, булькатала зайздрасць нападнікаў. Нарадзіўся ў іх падступны план: скрасці рондаль, каб не нараджаліся новыя маляткі-пельмяткі, а тых пельменяў, якія ўжо існуюць, з’есці ці, прынамсі, панадкусваць.

Хутка здрадліва напалі зайздроснікі на мірны горад. Разгубіліся спярша пельмені. Кінуліся ў лес, шукаючы схованку. Спатрэбілася цэлая ноч, каб адысці ад першага шоку. А з першымі промнямі сонца ўбачылі пельмені, што бяда аб’яднала іх, і што толькі талакой перамогуць. Акрамя таго, звярнуліся пельмені за дапамогай да сяброў-суседзяў – катлет.

Адным вялікім гуртом рушылі хаўруснікі ў горад. Падступныя нападнікі былі яшчэ ў цэнтры, дзе спрабавалі зрушыць велізарны рондаль. Накінуліся пельмені і катлеты на людзей. Распачалася жорсткая бойка. Нарэшце, нападнікі былі выціснутыя з горада.

Многія жыхары загінулі. Але вы, вядома, памятаеце пра чароўны дар пельменяў: кожны з іх меў па 9 жыццяў. Таму неўзабаве ўсе раны абаронцаў горада загаіліся, і пельмені адрадзіліся яшчэ лепшымі. Многія з іх аддалі па адным жыццю катлетам, каторыя не мелі такога чароўнага дару.



У памяць аб перамозе справядлівасці над зайздрасцю паўстаў у самым сэрцы пельменнага горада велічны помнік: стомленыя, але шчаслівыя пельмешкі абдымалі адно аднаго.

Вядома, бяда змяніла нашых герояў. Найперш, убачылі яны, што здолелі перамагчы толькі дзякуючы згуртаванасці і супольнай барацьбе. Таксама зразумелі пельмені, як важна, каб было іх шмат, таму па ўсім горадзе сталі ўзнікаць новыя рондалі, дзе нараджаліся маленькія тлусценькія смяшлівыя пельмешкі.

З радасцю і лагодай сустракалі іх дарослыя пельмені, каб шчасліва і годна правесці кожны дзень свайго пельменнага жыцця.




*ПРАЦЯГ БУДЗЕ...*

## НАШЫ ХАЙКУ

*Хайку ці хоку* - японскія вершы, вядомыя ўжо больш за 700 гадоў. Паэтку ці паэта, якія пішуць хайку, называюць *хайдзін.* Найбольш знаным японскім хайдзінам быў *Мацуа Басё*.

Звычайна хайку складаецца з трох радкоў. У хайку гаворка заўсёды ідзе пра прыроду ды абавязкова ёсць указанне на пару года. Хайку заўсёды пішуць у часе цяперашім, бо галоўная задача яго - "схапіць", "сфатаграфаваць" імгненне прыроды словам.





Сцюжа
моцная, белая, халодная
дзьме на ўсё і ўсіх - снег нясе.

---

Снег
халодны, мяккі, беласнежны
вельмі доўга спіць.

---

Сняжынка
белая, маленькая, халодная
ляціць на Поўнач.

---

Снег
халодны, белы, вясёлы
радуе ўсіх.

---

Падснежнік
белы, духмяны, маленькі
расце ў лясочку.

---

Кветкі
каляровыя, духмяныя, маладыя
растуць у цудоўным садзе.

## КАЛІ ДАРОСЛЫЯ БЫЛІ ДЗЕЦЬМІ...

Ці цікава вам, якія смешныя і забаўныя гісторыі адбываліся з вашымі настаўнікамі ды бацькамі ў дзяцінстве?

Нам цікава! Таму дзяўчаты Мар'я і Фрося распыталі дарослых пра іх дзяцінства.

І вось што даведаліся...

***Размоўца (інтэрв'юерка) - Мар'я***

***Рэспандэнтка (інтэрв'юіруемая) - настаўніца беларускай мовы Вольга Краўчанка***



***Мар’я:*** Вольга, распавядзіце, калі ласка, цікавую гісторыю са свайго дзяцінства.

***Вольга:*** Аднойчы, калі я вучылася ў трэцім класе, захварэла наша самая любімая настаўніца - Мар'я Іванаўна. Мы з аднакласнікамі вельмі сумавалі без яе. І вось што прыдумалі... Зусім без дарослых усе дзеці трэцяга класа сабраліся, знайшлі яе адрас і пайшлі наведаць Мар'ю Іванаўну проста ў яе дома. Калі мы прыйшлі, яна была вельмі ўзрадаваная і адразу напаіла нас гарбатай. Толькі чамусьці наша настаўніца была крыху збянтэжаная... Гэта цяпер я разумею, што мы заваліліся да яе ў госці такім вялікім натоўпам зусім без папярэджання, каб проста сказаць, як мы без яе сумавалі. Мар'я Іванаўна пасля такога візіту праз тыдзень вярнулася да нас і сказала, што яна была вельмі радая прыняць нас у гасцях і менавіта праз гэта так хутка ачуняла.

***Размоўца (інтэрв'юерка) - Фрося***
***Рэспандэнт (інтэрв'юіруемы) - тата Дзяніс***



***Фрося:*** Тата, распавядзі, калі ласка, смешную гісторыю са свайго дзяцінства.

***Тата Дзяніс:*** Гэтая гісторыя здарылася са мной, калі я вучыўся ў шостым класе. Я дапамагаў тату будаваць лецішча. Нечакана яго папрасілі пад’ехаць дапамагчы іншым людзям. Я чакаў тату каля дзвюх гадзін і, урэшце, вырашыў паехаць дадому на ровары самастойна. Паколькі ключ ад лецішча быў толькі адзін, а мы з бацькам не дамовіліся, дзе яго пакінуць адзін аднаму, то я вырашыў напісаць фарбай на самым доме вялікімі літарамі “таемную” інфармацыю: “Ключ пад пнём”.

## МАЯ КАЛЕКЦЫЯ МАНЕТ

*Аўтар Уладзь*

Я люблю збіраць розныя рэчы. Ёсць у мяне і карты “Пакемон”, і карты з футбалістамі, і фанцікі “Турба”.

Але мая любімая калекцыя – гэта калекцыя манет. У ёй ужо 155 экзэмпляраў! Паходзяць манеты з краін Еўропы, Азіі, Афрыкі, Аўстраліі, Паўночнай і Паўднёвай Амерык. Атрымліваецца, з усіх кантынентаў, акрамя Антарктыды.




Самыя далёкія ды экзатычныя краіны, з якіх я маю свае манеты, – гэта Сурынам, Кенія, Сінгапур, Карыбы, Філіпіны, Індыя, Непал, Сейшэлы, ААЭ.

Самыя старыя манеты ў маёй калекцыі датуюцца 1905 г. (Бельгія), 1909 г. (Вугоршчына), 1923 і 1929 г. (Польшча), 1940 г. (Германія).




Калекцыю яшчэ ў дзяцінстве пачала збіраць мая маці, а я павялічыў яе ў тры разы. Зазвычай, папаўняю сваю калекцыю манетамі, што атрымліваю ад сяброў і знаёмых, якія прыязджаюць да бацькоў у госці. Акрамя таго, я купляю манеты на свае кішэнныя грошы ў спецыяльных крамах.

## НАШЫ ГАДАВАНЦЫ

*Аўтар Мікалай*

### Вавёрка



У мяне дома жыве сабака-дзяўчынка, яе завуць Вавёрка. Вавёрка з’явілася ў нас у 2019 годзе. Калі тата паехаў да заводчыка выбіраць гадаванца, то спачатку хацеў набыць іншага сабаку, але наша Вавёрка не разгубілася і весела аблізала тату. Вядома, пасля такога вітання тата абраў менавіта яе.

Вавёрка вельмі актыўная, таму больш за ўсё любіць гуляць на вуліцы. Вавёрка здольная бегаць надзвычай доўга!

*Аўтарка Мар'я*



### Шашка

Як можна гуляць у адну шашку? Проста: пагуляць з нашым катом Шашкай. Безумоўна, ёсць і іншыя варыянты гэтага імя, напрыклад: Шаша, Шаха, Шашэнька ці Мя (гэтым імем ён сам сябе назваў). Раней у прытулку нашага ката звалі Спікер ці Булачка, але цяпер, напэўна, ён ужо не памятае ані прытулку, ані сваіх ранейшых імёнаў.

Але гэта не так значна, як тое, адкуль жа ён у нас з’явіўся. Шашка эміграваў разам з іншымі катамі з прытулку. Ну, і валанцёрамі, вядома, бо ён, здаецца, не мае пасведчання кіроўцы.

Таксама ў Шашкі ёсць адна дзіўная звычка. Калі ў вас жыве кот, то вы, пэўна, ведаеце, што каты не надта шмат мяўкаюць, але Шашка надзвычай гаваркі. У кватэры толькі і чутно: «Мя!», «Мяааааааааа!» ці «Мяааў!». А як Шашка выглядае, вы ўбачыце на здымках у артыкуле.



## НАШЫ ГАДАВАНЦЫ

*Аўтар Міша*

### Яша



Наш гадаванец – гэта яшчарка барадатая агама. Завуць нашага любімца Яша. У дзевяць гадоў я атрымаў яго ў падарунак. Яшу цяпер два гады. Яго любімая гульня – бегаць па доме і вывучаць прастору ў ім. Харчуецца наш гадаванец агуркамі, чарвякамі і цвыркунамі.



Аднойчы мы пакінулі Яшу без нагляду і ён вельмі надзейна схаваўся каля скрыні. Як жа доўга мы яго шукалі!

Я люблю браць Яшу на рукі ці калені ды гладзіць.

*Аўтарка Англеліна*



### Гірык

Нашага гадаванца завуць Гірык. Яму 8 гадоў. Наш Гірык мае шэрую поўсць і аранжавыя вочы. Я не ведаю, адкуль ён у нас з'явіўся, таму што Гірык старэйшы за мяне. Шчыра кажучы, Гірык мне не вельмі падабаецца, бо ён любіць драпаць мае ногі.

Гірык мае дзіўную звычку – аблізваць мае валасы, таму што я пахну цукеркамі. Пры гэтым ён гучна вуркоча і не дае мне спаць.

Наш гадаванец любіць ласавацца каўбаскай.

Цяпер Гірык жыве ў бабулі Соні на вёсцы. Там ён кожны дзень палюе на мышэй, кратоў, птушак і нават змей, а пасля прыносіць іх у хату. Бабуля Соня ўвесь час выкідае здабычу Гірыка, бо не ўмее яе гатаваць. Калі мы купім дом у Польшчы, то абавязкова забярэм яго да сябе.



# НАШЫ ГАДАВАНЦЫ

*Аўтарка Мар'я*

## Цвічок



Аднойчы каля дому я ўбачыла нічыйную котку з малым рудым кацянём. Яны жахаліся людзей. Было відаць, што котка і кацяня хочуць есці. Я пачала кожны дзень прыносіць ім кашэчыя ласункі. Паступова яны ўсё менш мяне баяліся.

Але аднаго разу мама котка знікла. Тады я забрала кацяня дадому і дала яму імя Цвічок. На той момант у нас ужо жылі два каты, таму я знайшла яму новы дом, дзе Цвічка любяць і песцяць.

*Аўтарка Міра*



## Морс

У мяне дома жыве сабака. Яго завуць Морс. Яму ўжо 10 гадоў. Морса нам падарылі яшчэ да майго нараджэння. Мой сабака вельмі добры і ласкавы. Морс любіць хадзіць на шпацыры, а таксама гуляцца з гумовымі цацкамі для сабак.

*Аўтар Арцём*

## Жужа

Калі мая маці была маладой дзяўчынай, у яе жыла котка Жужа.

Аднойчы Жужа адчыніла шафу з крупамі ды скінула іх на падлогу. Паколькі коткі не харчуюцца крупамі, то кемлівая Жужа пачала... коўзацца на крупах, як на лядовым катку! У самы разгар весялосці да коткі завітала нязваная госця – мая матуля, якая бязлітасна прыпыніла радаснае коўзанне на імправізаваным катку.



## НАШЫ ГАДАВАНЦЫ

*Аўтарка Соф'я*



### Оскар

У нас дома жыве кот. Яго завуць Оскар. Яму ўжо амаль дзесяць гадоў. Оскар мае бела-карычнева-чорную поўсць.

Оскар - надзвычай спакойны ды рахманы кот: ніколі нічога не падрапаў і не пагрыз.

Наш гадаванец вельмі любіць праводзіць час з людзьмі. Спіць Оскар выключна ў ложку з бацькамі, прычым пасля порцыі пяшчотных пагладжванняў ён забіраецца пад коўдру і салодка засынае.

*Аўтарка Люба Баркун*

### Сіма

У нас дома доўгі час жылі ажно тры коткі: Сіма, Мойка і Масяня.

Старэйшую котку звалі Сіма. Мы забралі яе ў Мінск з Радашковічаў - гарадскога пасёлка, у якім жыла мая прабабуля. Яшчэ маладой котачкай Сіма прыбілася да вясковага дома прабабулі Жэні. Мой дзядуля Міша часта наведваў сваю маму і не чуў, каб Сіма хоць некалі мяўкала.



Аднойчы дзядуля здзіўлена звярнуўся да прабабулі: "Гэта котка ніколі не мяўкае!". Тады Сіма павярнулася да яго, паглядзела проста ў вочы і гучна ды выразна сказала: "МЯЎ!". Акрамя таго, калі Сіма хацела выйсці на двор, а дзверы былі зачыненыя, яна скокала на ручку, павісала на ёй, і дзверы адчыняліся.

Сіма пражыла доўгае і шчаслівае жыццё - яна была з намі дваццаць гадоў!





## ДЛЯ САМЫХ ЦІКАЎНЫХ

*Аўтарка Люба Баркун*

### Рэкі Беларусі

У Беларусі працякае больш за 20 тысяч рэк. Усе гэтыя рэкі ўпадаюць у два моры: Чорнае ці Балтыйскае.

У IX-XII стст. па найбуйнейшых рэках Беларусі - Дняпры і Дзвіне - праходзіў старажытны шлях "з варагаў у грэкі". Гэты водны ды сухапутны гандлёвы шлях злучаў Балтыйскае і Чорнае моры, дазваляў перавозіць разнастайныя тавары ў абшарах ад Скандынавіі да Візантыі. На шляху "з варагаў у грэкі" ўзнікалі буйныя гарады, якія развіваліся і багацелі за кошт гандлю: Кіеў, Віцебск, Полацк, Ноўгарад.



### Злучы рэкі Беларусі з іх назвамі



## ДЛЯ САМЫХ ЦІКАЎНЫХ

*Аўтарка Люба Баркун*

### Мора Герадота

На поўдні Беларусі, на Палессі, працякае рака Прыпяць. Увесну яна выходзіць за свае берагі і затаплівае навакольныя палі, дубровы, дарогі ды нават вёскі. Параўнайце, як выглядае Прыпяць улетку і ўвесну.





Магчыма, менавіта басейн ракі Прыпяць старажытнагрэчаскі гісторык Герадот амаль дзве з паловай тысячы гадоў таму называў морам. Падобна, што пасля сыходу апошняга ледавіка 12.000-10.000 гадоў таму назад, практычна ўвесь поўдзень Беларусі займала велізарнае возера, якое вельмі марудна, але забалочвалася. Аднак, і сёння разліў Прыпяці нагадвае нам пра старажытнае "Беларускае мора".





